5. Спецсводка № 53 Речицкого райотделения НКВД Б.С.С.Р. «О ходе празднования XVII годовщины Октябрьской революции по Речицкому округу» от XI–1934 г. // ДАГАГВ. – Ф. 451. Воп. 2а. Спр. 158. Арк. 84–86.
6. Спецсводка № 42 Гомельского окротдела ГПУ Белоруссии «Ход закрытия церквей в деревнях и перегибы в антирелигиозной работе» по состоянию на 28 марта 1930 г. // ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 622. Арк. 113–117.
7. Спецсводка № 70 Гомельского окротдела ГПУ Белоруссии «О религиозной обстановке в округе (апрель 1930 г.)» // ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 623. Арк. 80–83.
8. Сводка № 5/сс «О происшествиях и деятельности Гомельского окружного административного отдела за время с 11/III по 20/III–1930 г.» // ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 622. Арк. 91–106.
9. Спецсводка № 25 «Политическое настроение деревни, в связи с коллективизацией и выселением кулачества по Гомельскому округу» по состоянию на 18 марта 1930 г. // ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 622. Арк. 22–29.

УДК 94:322(47+57):27-9-526.7

**Г. А. Аляксейчанка**
**Н. І. Казлова**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

## КАМПАНІЯ ПА ЎСКРЫЦЦІ СВЯТЫХ МОШЧАЎ ЯК СРОДАК НАГЛЯДНАЙ АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ Ў САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ

*Артыкул прысвечаны аднаму з элементаў антырэлігійнай палітыкі савецкай улады кампаніі па ўскрыцці святых мошчаў, ушанаваных Рускай праваслаўнай царквой. Меркавалася, што з яе дапамогай будзе нанесены сур'ёзны ўдар па прэстыжы Царквы і ўплыве духавенства на веруючых, што ў канчатковым выніку абумовіць крах рэлігіі ў савецкай дзяржаве. У артыкуле разглядзжаюцца асноўныя формы і спосабы правядзення кампаніі, паказаны адносіны савецкага насельніцтва да гэтага мерапрыемства. На аснове даследавання аўтары прыходзяць да высновы, што паспяховасць кампаніі была*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*сумнеўная. Струмень ахвотнікаў пакланіцца мошчам не толькі не зменшыўся, але і значна павялічыўся.*

Савецкая дзяржава з першых дзён свайго існавання ўступіла ў перыяд барацьбы супраць Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ), якая на працягу доўгіх стагоддзяў з'яўлялася апорай царызму. Царква падлягала ліквідацыі разам з рэлігійным светапоглядам насельніцтва былой Расійскай імперыі. Ужо зімой 1917–1918 гг. былі прыняты дэкрэты, якія падрывалі юрыдычныя і эканамічныя асновы існавання Царквы. Найболей важным з іх быў дэкрэт «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы», які афіцыйна называўся «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных аб'яднаннях», прыняты 23 студзеня 1918 г. [1]. Аднак, трэба адзначыць, што паколькі большая частка насельніцтва савецкай дзяржавы не мела адукацыі, нават не магла чытаць, то ўлады больш увагі, пры правядзенні антырэлігійнай палітыкі, надавалі наглядным сродкам антырэлігійнай агітацыі і прапаганды.

Так, яркім прыкладам нагляднай прапаганды і стала кампанія па ўскрыцці святых мошчаў з наступнай шырокай антырэлігійнай «рэкламай». Гэта кампанія ішла ў рэчышчы рэалізацыі дэкрэта ад 23 студзеня 1918 г., для правядзення якога быў створаны Ліквідацыйны V (пазней VIII) аддзел Народнага камісарыята юстыцыі (НКЮ) РСФСР пад кіраўніцтвам П. А. Красікава. Таксама кампанія заняла цэнтральнае месца ў праграме мер агульнадзяржаўнага ўзроўню, накіраванай на выкананне ўсталёўкі VIII з'езда РКП (б) (1919) аб «поўным адміранні рэлігійных забабонаў» і Царквы. У часопісе «Революция и церковь» асвятляўся ход гэтай акцыі, друкаваліся інструкцыі і паясненні па арганізацыйным пытанням [10, с. 66].

Для савецкай прапаганды культ праваслаўных святых і іх мошчаў з'яўляўся адным з самых галоўных аб'ектаў крытыкі. Ускрыццё святых мошчаў задумвалася як акцыя, накіраваная на «выкрыццё перад масамі векавога падману царквой працоўнага народу» [2]. Ідэолагі кампаніі лічылі, што, падарваўшы шырока распаўсюджанную сярод праваслаўных веру ў нятленнасць астанкаў святых, яны не толькі дыскрэдытуюць царкоўную іерархію, якая «падманвала» народ, але і пазбавяць царкву моцнага каналу прытока ахвяраванняў. Так, святыя мошчы, здольныя вылечваць хворых і хілых, паўсюдна станавіліся цэнтрамі масавага паломніцтва і дазвалялі праваслаўным цэнтрам збіраць значныя сродкі. Ліквідацыйны аддзел Наркамата Юстыцыі адносіў мошчы «да разраду псіхалагічна ўплывовых дэманстрацый» [10, с. 68].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Савецкая «машчавая» кампанія вядзе адлік з 23 кастрычніка 1918 г., калі было праведзена ўскрыццё мошчаў святога Аляксандра Свірскага атрадам чырвонаармейцаў пад кіраўніцтвам А. Вагнера. Згодна з версіяй, якая адлюстроўвалася савецкай прапагандай, рашэнне аб ускрыцці было прынята пасля таго, як камісія, якая прымала на ўлік маёмасць Аляксандра-Свірскага манастыра ў Аланецкай губерні, выявіла ў рацы святога «васкавую ляльку». Гэтая падзея атрымала шырокую вядомасць, і «па настойлівым патрабаванням працоўных», якія былі абураны царкоўным падманам, у краіне пачалася маштабная кампанія па ўскрыцці святых мошчаў [11].

Так, кампанія праводзілася зыходзячы з ініцыятывы мясцовых саветаў, або, як адзначалася ў справаздачах, саміх працоўных. Ускрыццё праводзілася ў прысутнасці прадстаўнікоў савецкіх і партыйных органаў, медработнікаў, якія складалі і падпісвалі акт медыцынскага агляду мошчаў. Інструкцыі НКЮ давалі рэкамендацыю праводзіць ускрыццё, прытрымліваючыся «вядомага такту ў адносінах да рэлігійных пачуццяў прыхільнікаў праваслаўнай веры». Згодна з гэтым прапанавалася не праводзіць дадзеную акцыю пад час набажэнства, або пры вялікім скапленні веруючых. Сам працэс ускрыцця мошчаў, зняцця з іх пакроваў і г. д. павінны былі выконваць прадстаўнікі духавенства. Цыркуляр «Аб раскрыцці мошчаў» Аддзела кіравання НКУС ад 23 красавіка 1919 г. патрабаваў ад губвыканкамаў: «Ні ў якім разе не дзейнічаць так, каб потым трэба было прыбегнуць да ўзброеных метадаў. Правядзенне кампаніі шырока выкарыстоўвайце ў друку, лекцыях, мітынгах» [2]. Пасля таго, як быў падпісаны пратакол аб ускрыцці мошчаў, астанкі святых выстаўлялі на ўсеагульны агляд. Далейшы лёс мошчаў вызначала пастанова НКЮ ад 1 сакавіка 1919 г., у якой адзначалася: «Для таго, каб ліквідаваць магчымасці выкарыстання ў далейшым падман з мошчамі, праз некаторы час, дастатковы для таго, каб народ пераканаўся ў падмане, адкрытыя ракі з усім, што там было змешчана, пасля вопісу перадаць у распараджэнне губвыканкамаў… у мясцовыя музеі, у аддзелы царкоўнай даўніны» [2].

Здзекване над рэлігійнымі пачуццямі веруючых выклікала хвалю антыўрадавых выступаў па ўсёй савецкай дзяржаве. Абурэнне вернікаў выклікала ўскрыццё мошчаў прп. Сергія Раданежскага ў Троіца-Сергіевай лаўры ў красавіку 1919 года. З мэтай перашкодзіць апаганьванню святыняў Ціхан, патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі, неаднаразова накіроўваў лісты кіраўнікам савецкай дзяржавы. У лісце ад 10 мая 1920 года старшыне саўнаркама У. І. Леніну патрыярх настойліва прасіў пакінуць мошчы прп. Сергія Раданежскага ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Троіца-Сергіевай лаўры і «вярнуць вернікам волю шанавання святых рэштkaў святога Сергія…». Але ўлада працягвала разгортваць кампанію па ўскрыцці мошчаў, якая суправаджалася зачыненнем манастыроў [11]. 30 ліпеня 1920 года саўнаркам прыняў пастанову «Аб ліквідацыі мошчаў ва ўсерасійскім маштабе». Цыркулярам НКЮ ад 25 жніўня таго ж года загадвалася поўная ліквідацыя мошчаў, перадача іх у музеі, «у выпадках выяўлення шарлатанства, фальсіфікацый і іншых крымінальных дзеянняў» аддзелы юстыцыі павінны былі ўзбуджаць «судовы праслед супраць усіх вінаватых людзей» [5, с. 73].

Ускрыццё мошчаў суправаджалася маштабнай агітацыйна-прапагандысцкай працай: лекцыямі, дыспутамі, артыкуламі ў перыядычным друку. У часопісе «Революция и церковь» друкаваліся пратаколы ўскрыцця, артыкулы народнага камісара аховы здароўя Н. А. Сямашка і спецыяліста па судовай медыцыне П. С. Сямёноўскага, якія раскрывалі чытачам навуковыя аспекты муміфікацыі трупаў. Так, вынікі агляду некаторых мошчаў запатрабавалі асобага падыходу да іх ацэнкі падчас антырэлігійнай агітацыі і прапаганды. Адзін з такіх выпадкаў апісаны ў змешчанай у газеце «Курская праўда» справаздачы аб ускрыцці мошчаў Ёасафа Белгарадскага 1 снежня 1920 г. «Прысутная публіка была паражана высокай ступенню захаванасці цела, што праляжала ў труне 166 гадоў. Людзям здавалася, што гэта вынік штучнай муміфікацыі, і яны прасілі лекара разразаць жывот, каб пераканацца ў яго змесціве. Хірург зрабіў разрэз і выняў частку кішак, зусім сухіх, што паказвае натуральнасць працэсу муміфікацыі» [11]. Таму вялікая ўвага ў афіцыйным друку таго часу надавалася «навуковаму тлумачэнню выпадкаў нятлення». У часопісе «Рэвалюцыя і царква» была апублікавана цэлая падборка матэрыялаў пад загалоўкам: «Дадзеныя навукі аб муміфікацыі трупаў». «Цёплая тэмпература навакольнага асяроддзя, цыркуляцыя сухога паветра і здольнасць глебы, – пісаў Н. А. Сямашка, – добрыя ўмовы натуральнай муміфікацыі трупаў». Сістэматызуючы вынікі кампаніі, ён пісаў: «У пераважнай большасці выпадкаў (36) ад трупаў засталіся толькі чэрапы і буйныя трубчастыя косткі, як зусім найболей стойкія да гніласнага разбурэння... ». [3, с. 16–17].

Ад пачатку і да канца кампаніі савецкая і партыйная прэса паведамляла аб выяўленых выпадках «фальсіфікацыі царкоўнікамі нятленных мошчаў». У друку з’явіліся паведамленні аб тым, што ў выкрытай рацы Арцемія Веркольскага ў Вялікім Усцюгу «не апынулася і прыкметы на цела і косткі», тым часам як у рацы Яфрэма Наваторжскага ў Таржку знаходзіліся «шэсць лішніх костак».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У шэрагу выпадкаў у раках святых былі выяўлены прадметы, якія не адносіліся ні да асобы святога, ні да культу яго шанавання (напрыклад, «банка фірмы «Бракар» – у рацы св. Паўла Абнорскага ў Яраслаўскай губерні, «шпілька, цвікі і гайкі» – у рацы св. Макарыя Калязінскага ў Цвярской губерні) [5, с. 76].

Нагляднымі сродкамі агітацыі, пры правядзенні кампаніі, з'яўляліся і так званыя «паказальныя выставы» канфіскаваных мошчаў святых у музеях. Так, у 1920-м г. у Маскве ў музеі Народнага камісарыяту аховы здароўя праходзіла выстава па «спецыяльная медыцыне», на якой былі прадстаўлены некаторыя мошчы святых. Музейнымі працаўнікамі быў арганізаваны «аддзел па гніенні і раскладанні жывёльных прадметаў», у якім рэшткі свяціцеля Іясафа Белгарадскага былі змешчаны поруч з муміфікаванымі трупамі фальшываманетчыка, пацука і кажана – «для паказу падабенства працэсаў гніення ва ўсіх гэтых трупах». Закранаючымі рэлігійныя пачуцці веруючых былі і надпісы, якія тлумачылі асобныя рэчы выставы. Напрыклад, «змаганне з рэлігійнымі забабонамі гэтак жа патрэбна, як змаганне з заразнымі хваробамі» [11]. Асноўная мэта выставы, на думку наркама аховы здароўя Н. Сямашкі, – «спрыяць спыненню рэлігійных абрадаў, і шанаванню «святых мошчаў» [4, с. 31].

Ускрыццё і ліквідацыя мошчаў святых нярэдка суправаджалася закрыццём храмаў і манастыроў у якіх яны знаходзіліся. Так, дэкрэтам ад 20 красавіка 1920 г. Троіцка-Сергіева Лаўра была пераўтворана ў гісторыка-мастацкі музей. Адбываліся і судовыя працэсы над служыцелямі Царквы і веруючымі. У ходзе кампаніі 1918–1920 гг. было ўскрыта больш за 60 грабніц з мошчамі. Асобныя ўскрыцці праводзіліся і пазней [5, с. 81]. Так, 14 мая 1922 г. была ўскрыта рака з мошчамі святой Ефрасіні Полацкай, якія былі перададзены ў антырэлігійны аддзел Віцебскага Дзяржаўнага музея. Ускрыццё суправаджалася фотаздымкай, матэрыялы якой выкарыстоўваліся прапагандай [6, с. 15]. У верасні 1925 г. была праведзена дадзеная кампанія ў Салаўках, дзе было арганізавана ўскрыццё мошчаў святых прападобнага Германа і прападобнага Ірынарха Салавецкіх. Мошчы былі сфатаграфаваны і перададзены на захоўванне ў гісторыка-археалагічны аддзел музею [7, с. 8].

У. І. Ленін надаваў гэтай кампаніі вялікую выхаваўчую ролю. 17 сакавіка 1919 г. ён напісаў запіску наркому юстыцыі Д. І. Курскаму з прапановай публічна раскрыць мошчы ў Чудавым манастыры. Калі У. І. Ленін даведаўся ад П. А. Красікава, што ўскрыццё мошчаў Сергія Раданежскага ў Троіца-Сергіеўскай Лаўры было заснята на кінастужку, то 12 красавіка 1919 г. загадаў «каб хутчэй паказалі гэтае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кіно па ўсёй Маскве» [10, с. 89]. Па ўспамінах В.Д. Бонч-Бруевіча, У.І. Ленін рэкамендаваў здымаць і дэманстраваць насельніцтву фільмы, знятыя пры ускрыцці мошчаў: «паказаць, якія менавіта былі «святасці» ў гэтых багатых раках і да чаго шмат стагоддзяў з пачуццём глыбокай павагі ставіўся народ, гэтага дастаткова, каб адштурхнуць ад рэлігіі сотні тысяч людзей» [11]. Кампанія атрымала высокую адзнаку з боку кіраўнікоў савецкай антырэлігійнай прапаганды, якія бачылі ў ёй асаблівы шаг у накірунку вызвалення народных мас ад рэлігіі. Так, Е. Яраслаўскі ў 1921 г. пісаў: «Пад уплывам агітацыі, выкрыцця ўсялякага роду хлусні, ускрыцця мошчаў і іншых фактаў свядомасць шырокіх колаў насельніцтва значна ачысцілася ад смецця, якім яно было засмечана на працягу стагоддзяў» [8, с. 7].

Аднак, трэба адзначыць, што свядомасць веруючых адмаўлялася ўспрымаць факты, якія казаліся відавочнымі для антырэлігійных кадраў. Ем. Яраслаўскі, адзначаючы значэнне кампаніі па раскрыцці святых мошчаў ў барацьбе з рэлігійнымі перажыткамі, прызнаваў: «Сапраўды, бываюць настолькі пашкоджаныя рэлігіяй мазгі… Чалавеку пакажаш – сам бачыць – што ў грабніцы трухля, моль, чэрві, ніякіх мошчаў няма, а ён назаўтра ўсім распавядае, як мошчы збеглі пад зямлю ад няверных камуністаў. Гэтыя людзі так і памруць з такімі пашкоджанымі мазгамі: як жа інакш назваць чалавека, які бачыць тое, чаго няма і не можа быць!» [9].

Такім чынам, кампанія па ўскрыцці царкоўных каштоўнасцей характарызавалася ўмяшаннем савецкай улады ў царкоўныя справы дзеля падрыву яе аўтарытэта ў масах. Мера па канфіскацыі мошчаў і перадачы іх у музеі фактычна была накіравана на ліквідацыю культу мошчаў як асновы абрадавага жыцця РПЦ. Аднак, дадзеная кампанія не змяніла стаўленне веруючых людзей да сваіх святыняў, а ў некаторых з іх, наадварот, яна выклікала рэлігійны пад’ем. Значная колькасць веруючых прыходзіла да канфіскаваных і выстаўленых на ўсеагульны агляд у музеях і на выставах рэшткам святых з набожнасцю і малітвамі.

Трэба адзначыць, што разглядаемая кампанія мела для Царквы не толькі адмоўнае значэнне. Ускрыццё мошчаў назаўжды ліквідавала меркаванне аб іх «нятленнасці», якое існавала стагоддзямі. У канцы XX стагоддзя рэшткі святых былі зноў перададзены Царкве і цяпер шануюцца веруючымі, але, у адрозненні ад сітуацыі стагадовай даўнасці ніхто не заве мошчы «нятленнымі». Шанаванне мошчаў святых у сучасным праваслаўі носіць вольны характар і з’яўляецца ўвасабленнем свядомых рэлігійных перакананняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс крыніц і літаратуры


1. О свободе совести, церковных и религиозных обществах: декрет СНК РСФСР от 20 января 1918 г. // Декреты Советской власти: в 5 т. – М.: Гос. изд-во полит. литературы, – 1957. – Т. 1. – С. 373–374.

2. Отчет VIII-го Отдела Народного Комиссариата Юстиции Съезду Советов [Электронны рэсурс] // Революция и церковь. – № 2. – 1919. – Режим доступу: http://www.portal-credo.ru/site/act= news&id= 96820. – Дата доступу: 02. 11. 2017.

3. Семашко, Н. Л. Вопрос о «мощах» с научно-методической точки зрения / Н. Л. Семашко // Революция и церковь. – 1919. – № 1. – С. 16–17.

4. Семашко Н. Л Наука и шарлатанство / Н. Л. Семашко // Революция и церковь. –1922. –№3. –31 с.

5. Отчет VIII (ликвидационного) отдела НКЮ VIII-му Всероссийскому съезду Советов // Революция и церковь. – 1920. – № 9–12. – С. 72–82.

6. Нетленные мощи Ефросинии Полоцкой // Безбожник у станка. – 1928. – № 9. – 15 с.

7. Вскрытие «мощей» в Соловках // Безбожник. – 1925. – № 2. (ноябрь). – С. 8–9.

8. Ярославский, Е. 10 лет на антирелигиозном фронте / Е. Ярославский // Антирелигиозник. – 1927. – № 9. – С. 3–19.

9. Ярославский, Е. М. О методах антирелигиозной пропаганды [Электронны рэсурс] / Е. М. Ярославский // Против религии и церкви. Т. III. Пролетарская революция в борьбе с религией / под ред. Шейнмана. – М.: ОГИЗ, 1935. – Рэжым доступу: http://www.twirpx.com/file/1659589/. – Дата доступу: 12. 11. 2017.

10. Алексеев, В. А. Иллюзии и догмы / В. А. Алексеев. – М.: Политиздат, 1991. – 400 с.

11. Лучшев, Е. М. Антирелигиозная пропаганда в СССР: 1917–1941 гг. [Электронны рэсурс] / Е. М. Лучшев. – СПб.: Информационно-техническое агентство Ритм, 2016. – 364 с. – Рэжым доступу: http://www.twirpx.com/file/2173645/. – Дата доступу: 13.10.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ